**Тэма 8. Рэвалюцыйныя рухі сярэдзіны 17 ст. у Паўднёвай Італіі і Партугаліі. Фронда ў Францыі.**

1. Рэвалюцыйныя падзеі ў Неапалітанскім каралеўстве.
2. Нацыянальнае вызваленне і станаўленне незалежнай Партугаліі.
3. Фронда ў Францыі.

Літаратура.

История Европы: в 8 т. Т. 4. – М., 1994.

Бондарчук, В.С. Неаполитанская революция, 1647–1648 гг. / В. С. Бондарчук. – М., 1994.

1. У пачатку 17 ст. уладанні іспанскай манархіі на Поўдні Італіі ўключалі тры каралеўствы: Неапалітанскае, Сіцылійскае і Сардзінскае. Непасрэдна кіравалі імі віцэ-каралі. Яны прызначаліся з тытулаванай іспанскай знаці і павінны былі строга прытрымлівацца ў сваёй палітыцы ўказанняў іспанскага караля. З метраполіі ў Паўднёвую Італію іспанцы прынеслі элементы абсалютысцкіх парадкаў. Задача гэтай сістэмы кіравання заключалася ў атрыманні максімальных фінасавых рэсурсаў.

Прычыны Неапалітанскай рэвалюцыі звязаны з сацыяльна-эканамічным развіццём Паўднёвай Італіі ў канцы 16 – першай палове 17 ст. У сельскай гаспадарцы назіралася падзенне даходаў з зямлі. Гэта штурхала сеньёраў да ўзмацнення феадальнай эксплуатацыі сялянства. Адбывалася аднаўленне старых, часта ўжо забытых праў дваранства. Частка дваранаства прадавала свае феоды гарадской буржуазіі. Але і яе прадстаўнікі працягвалі эксплуатацыю сялян феадальнымі метадамі, далучаліся да феадальнай рэакцыі. Гэта вяло да масавага пагаршэння становішча сялянства.

Для Неапалітанскага каралеўства было характэрна зрошчванне феадальнай арыстакратыі са сталічным патрыцыятам. Разам з іспанскімі грандамі яна вызвалялася ад падаткаў і павіннасцей і мела перавагу пры заняцці дзяржаўных пасад. Гарадская джунта (муніцыпалітэт) Неапаля таксама быў пад кантролем арыстакратыі. Сталічнае дваранства ўсімі сродкамі перашкаджала пранікненню ў свае рады прадстаўнікоў буржуазіі. Гэта стварала ў неапалітанскім грамадстве напружанасць, якая ўзрастала па меры роста буржуазіі. У той жа час палітыка іспанскіх улад каралеўства спрыяла росту ўплыву буйной буржуазіі. Адбываўся актыўны продаж пасад прадстаўнікам буржуазіі, што адкрывала для яе доступ да кіравання дзяржавай. У выніку склалася служылае дваранства, якое іспанцы супрацьпастаўлялі старой феадальнай арыстакратыі. Фінансава буржуазія была значна мацнейшая, чым феадальная арыстакратыя. Незадавальненне буржуазіі прывілеямі арыстакратыі не пераходзіда ў адкрыты пратэст.

Пратэстны патэнцыял накапліваўся сярод народных мас Неапаля: рамеснікі, дробныя гандляры, плебс. Ён быў выкліканы ў першую чаргу ростам падатковага ціску і ростам цэн. У Неапалі ва ўмовах Трыццацігадовай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

вайны кожны год уводзіліся новыя падаткі. Штуршком да паўстання стала ўвядзенне чарговага новага падатка – на садавіну.

Незадавальненне падатковым ціскам прывяло да паўстання і ў сталіцы Сіцыліі Палерма 27 мая 1647 г. Яно перакінулася на іншыя гарады Сіцыліі. У выніку паўстання віцэ-кароль Сіцыліі адмяніў усе пошліны. Падзеі ў Сіцыліі аказалі ўплыў на сітуацыю ў Неапалі. 7 ліпеня пачалося паўстанне. Паўстаўшыя на чале з вулічным гандляром рыбай Мазаньело накіраваліся да палаца віцэ-караля герцага д'Аркоса. Той заявіў аб гатоўнасці выканаць патрабаванні неапалітанцаў. 8 ліпеня да паўстання далучыліся атрады гарадской міліцыі. Палацы многіх арыстакратаў, адкупшчыкоў былі разбураны, як і будынкі ўстаноў, якія займаліся зборам падаткаў. 12 ліпеня паўстаўшыя вылучылі Дагавор прымірэння (23 артыкулы), які ўтрымліваў асноўныя патрабаванні да віцэ-караля: роўнае прадстаўніцтва народа і нобілей у муніцыпалітэце; адмена ўсіх пошлін, якія былі ўведзены пасля Карла V; прысячэнне спекуляцый харчовымі таварамі; улады павінны прымаць толькі тыя рашэнні, якія будуць адобраны народам. Герцаг д'Аркасон адобрыў Дагавор прымірэння. Мазаньело пры гэтым заявіў, што дзейнічаў у інтарэсах іспанскай кароны. Г. з. паўстанцы ў той момант не ставілі пытанне аб нізлажэнні ўлады іспанскай манархіі. Ужо 16 ліпеня Мазаньело быў забіты.

Паўстанне ў Неапале дало штуршок антыфеадальным выступленням у правінцыі. У іх прымалі ўдзел не толькі сяляне, але і рамеснікі, дробныя гандляры,часам нават дробныя дваране, якія таксама пакутавалі ад праізволу баронаў. Антыфеадальныя паўстанні часта спалучаліся з антыпадатковымі, бо бароны часта мелі права ўводзіць ускосныя падаткі, гандлёвыя пошліны. Адбываліся напады на рэзідэнцыі сеньёраў, расправы з феадаламі.

У Неапалі пасля смерці Мазаньело кіраўніцтва паўстаннем перайшло да буржуазных колаў на чале з Джэноіно. Буржуазныя колы Неапаля імкнуліся выкарыстаць народнае выступленне, каб абмежаваць ролю дваранства ў гарадскім кіраванні. Аднак Джэноіно аказаўся няздольным вылучыць праграму, якая змагла б аб'яднаць усе сілы паўстанцаў. Пры гэтым заставаўся верным іспанскай кароне. У жніўні ў Неапалі адбылося новае народнае паўстанне, накіраванае не толькі супраць іспанцаў, але і супраць заможных гараджан. Іспанцы пайшлі на новыя саступкі, пагадзіўшыся пашырыць удзел народа ў кіраванні горадам ("58 артыкулаў"). А Джэноіно быў абвінавачаны ў здрадзе і вымушаны быў пакінуць Неапаль. Тым часам Філіп IV адмовіўся зацвердзіць Дагавор прымірэння, ля берагоў Італіі з'явіўся іспанскі флот на чале з донам Хуанам. 4 кастрычніка ён пачаў абстрэл Неапаля. Адначасова ў наступленне перайшлі атрады дваранскага апалчэння, якія прыбылі пад сцены Неапаля з розных правінцый. Аднак падавіць паўстанне сілай не ўдалося.

17 кастрычніка паўстаўшыя накіравалі "Маніфест вернападданейшага народа" папе, імператару, каралям, у якім прасілі дапамогі ў вызваленчай вайне супраць іспанцаў. Такім чынам, у праграме паўстання з'явілася ідэя незалежнасці. У канцы кастрычніка 1647 г. была абвешчана Неапалітанская

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

рэспубліка. У гэты час начале паўстання стаяў Джэннаро Аннезе, рамеснік. Аднак сярод паўстаўшых не было дакладнага разумення, што сабой павінна ўяўляць гэтая рэспубліка з пункту гледжання дзяржаўнага ладу. Юрыст Вінчэнцэ Андрэо ў якасці ўзора прапаноўваў Галандыю. Іншыя лідары рэвалюцыі схіляліся да ўзору італьянскіх гандлёвых рэспублік.

Лідары паўстання звярнуліся з просьбай аб дапамозе да французскага караля Людовіка XIV і герцага дэ Гіза. Прыбыўшы ў снежні 1647 г. у Неапаль Гіз быў прызначаны галоўнакамандуючым і абвешчаны дожэм рэспублікі. Але рэальнай значнай ваеннай дапамогі ад Францыі Неапаль не атрымаў. Гіз разлічваў пасля выгнання іспанцаў заняць неапалітанскі трон і для гэтага шукаў падтрымкі арыстакратыі.

Аслаблялі рэспубліку і пастаянныя раздоры паміж яе лідарамі. Не ўдалося наладзіць узаемадзеянне паўстаўшага Неапаля з сялянскім рухам у правінцыі. Хаця сялянскія атрады часта дасягалі колькасці некалькіх тысяч чалавек і бралі штурмам гарады. Гэтыя штурмы суправаджаліся разграбленнем маёмасці. Дадзеныя абставіны падштурхоўвалі заможныя колы гарадоў, у тым ліку і Неапаля, шукаць кампраміс з іспанцамі. Бароны выступілі на баку іспанцаў. Названыя абставіны дазволілі іспанцам 6 красавіка 1648 г. аднавіць кантроль над Неапалем, не сустрэўшы супраціўлення. Неапалітанская рэспубліка была разгромлена. У правінцыі яшчэ некалькі месяцаў працягваліся сялянскія выступленні. Да канца 1648 г. яны былі падаўлены. Рэвалюцыя пацярпела паражэнне. Тады ж было падаўлена і паўстанне на Сіцыліі.

Раз’ яднанасць гарадскіх антыфеадальных сіл і сялянскіх паўстанняў, слабасць буржуазных слаёў прывялі да таго, што ў Неапалі і на Сіцыліі не ўдалося звергнуць іспанскае панаванне і падарваць феадальныя парадкі. Паражэнне рэвалюцыі 1647–1648 гг. прывяло да кансервацыі феадальных парадкаў, да фарміравання сацыяльна-эканамічнага адставання Паўднёвай Італіі. Гэтаму садзейнічала і тое, што сама Іспанія, пад уладай якой знаходзілася Паўднёвая Італія, усё больш перажывала ў другой палове 17 ст. эканамічны заняпад.

2. У 1578 г. партугальскія войскі на чале з каралём Себасцьянам высадзіліся на паўночнае ўзбярэжжа Афрыкі. У бітве пры Алькасер-Кебірэ мусульмане разграмілі партугальскую армію, сам кароль быў забіты. Улада перайшла да сваяка караля Себасцьяна кардынала Энрыке. У 1580 г. ён памірае. Пасля гэтага прэтэнзіі на партугальскую карону прад’явіў ісканскі кароль Філіп II. Ён спасылаўся на сваяцкія сувязі з мясцовай дынастыяй. У Партугалію ўступілі іспанскія войскі, які разбілі партугальскую армію. Ва ўмовах ваеннай акупацыі партугальскія картэсы ў красавіку 1581 г. абвясцілі Філіпа II каралём Партугаліі на пэўных умовах. Па іх Партугалія захавала ўласныя картэсы, ранейшае заканадаўства, сваю падатковую сітэму, бюджэт, манету. Іспанцы не мелі права ўрывацца ў партугальскія калоніі, партугальская армія не павінна была выкарыстоўвацца Філіпам II за межамі Партугаліі. Афіцыйнай мовай заставалася партугальская. Аб’яднанне Іспаніі і

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Партугаліі адбылося на аснове асабістай уніі: дзве краіны мелі адзінага манарха. Кароль Іспаніі ў Партугаліі меў імя Філіп I.

Пры новай дынастыі вядучую ролю ў палітычным жыцці Партугаліі захавала мясцовая арыстакратыя. Яе эканамічная магутнасць грунтавалася на валоданні вялікімі латыфундыямі-майяратамі. Выхадцы з арыстакратыі складалі каралеўскі двор, займалі вышэйшыя дзяржаўныя пасады, у тым ліку ў калоніях. Фідалгу – ніжэйшы слой дваранства, які не меў вялікай зямельнай уласнасці, – мог разлічваць толькі на другарадныя пасады ў дзяржаўным апараце і службу ў арміі. У перыяд панавання Іспанскіх Габсбургаў умацаваўся саюз дзяржавы і царквы. Інквізіцыя жорства праследавала “новых хрысціян” (іудзееў, якія прынялі хрысціянства) і пратэстантаў. Узмацніўся ўплыў ордэна іезуітаў на палітычнае жыццё і сістэму адукацыі. У канцы 16 і ў першыя дзесяцігоддзі 17 ст. вярхоўную ўладу іспанскага караля ў Партугаліі прадстаўлялі віцэ-каралі, ці рэгенцкія саветы, якія складаліся пераважна з вышэйшага духавенства. Ключавую ролю ў кіраванні краінай адыгрывалі каралеўскія саветы, у якіх пануючае становішча займалі прадстаўнікі арыстакратыі. Картэсы як орган саслоўнага прадстаўніцтва склікаліся толькі адзін раз у1619 г.

З уступленнем на трон Філіпа III (1598–1621) іспанская карона пачынае дапускаць парушэнне традыцыйных правоў Партугаліі, злоўжываць сваёй уладай. Уводзяцца новыя падаткі, ажыццяўляюцца прымусовыя займы. На кіруючыя пасады прызначаюцца іспанцы. Гэтая тэндэнцыя яшчэ больш узмацнілася ў час царавання Філіпа IV, калі рэальная ўлада аказалася ў руках каралеўскага фаварыта Аліварыса. Працягваўся рост падаткаў, была ўведзена дзяржаўная манаполія на соль, бралася плата за замяшчэнне пасад. У час Трыццацігадовай вайны партугальскія войскі былі адпраўлены за межы краіны. Палітыка Аліварыса сведчыла пра яго імкненне пераўтварыць Партугалію ў адну з правінцый Іспаніі. Пры гэтым Іспанія аказалася няздольнай абараніць партугальскія калоніі. Галандцы і англічане рэгулярна нападалі на ўзбярэжжа Бразіліі, Мазамбіка, Анголы, астравы Інданезіі, Цэйлон.

Названыя факты выклікалі ў Партугаліі незадавальненне іспанскім панаваннем. Сярод партугальцаў шырокае распаўсюджванне атрымаў себасцьянізм – міф аб цудоўным выратаванні караля Себасцьяна. Рспаўсюджваліся чуткі, што ён хутка павінен вярнуцца на радзіму і вярнуць Партугаліі незалежнасць. Сталі з’яўляцца самазванцы, якія абвяшчалі сябе “каралём Себасцьянам”. Улады з імі жорстка распраўляліся, але народ працягваў верыць у вяртанне Себасцьяна. У 1620-я – 1630-я гг. з’явіліся шматлікія памфлеты, пропаведзі, у якіх гаварылася аб незаконнасці перадачы кароны Партугаліі Іспанскім Габсбургам, паказвалася шкода для Партугаліі палітыкі іспанцаў. Узмацненне падатковага ціску выклікала народныя выступленні ў гарадах. У 1637 г. у адным з буйнейшых гарадоў краіны Эворэ ўспыхнула народнае паўстанне супраць росту падаткаў і праізволу з боку іспанскіх улад. У канцы 1630-х гг. большасць насельніцтва Партугаліі была

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

настроена супраць іспанскага панавання. Габсбургі маглі разлічваць на падтрымку толькі часткі арыстакратыі і вышэйшага духавенства.

Восенню 1640 г. у Партугаліі склалася змова, у якой удзельнічала каля 40 знатных дваран на чале з архібіскупам Ліссабона. Змоўшчыкі ставілі мэтай аднавіць (рэстаўрыраваць) законную дынастыю ў Партугаліі. 1 снажня 1640 г. змоўшчыкі захапілі каралеўскі палац ў Ліссабоне. Каралём Партугаліі яны абвясцілі герцага Браганскага Жоана IV (1640–1656). Пераварот з мэтай аднаўлення незалежнасці атрымаў усенародную падтрымку. У 1641 г. былі скліканы картэсы, якія абвясцілі незалежнасць Партугаліі. Поспеху Партугальскай нацыянальнай рэвалюцыі спрыяла тое, што да 1659 г. Іспанія вяла вайну з Францыяй, і не мела дастаткова ваенных сіл, каб аднавіць кантроль над Партугаліяй. Тым не менш, Партугаліі прыйшлося весці працяглую вайну за незалежнасць, якая ўвайшла ў гісторыю як “вайна Рэстаўрацыі”.

Але ў самой Партугаліі ішла вострая палітычная барацьба, што аслабляла яе перад Іспаніяй. Паколькі Жоан IV атрымаў карону ў выніку дзяржаўнага перавароту, які ажыццявіла арыстакратыя, ён апынуўся ў залежнасці ад вышэйшай знаці. Каб зменшыць гэтую залежнасць, кароль пачаў папаўняць рады грандаў выхадцамі з дробнага дваранства, з чым пагаджалася далёка не ўся арыстакратыя. Пры двары адбывалася пастаянная барацьба арыстакратычных груповак за ўладу. Не ўся арыстакратыя была згодна з тым, што кароль парваў усе гандлёвыя сувязі з Іспаніяй, ліквідаваў касцільскую сістэму кіравання. Ужо праз некалькі месяцаў пасля Рэстаўрацыі была раскрыта змова часткі арыстакратаў супраць караля. Частка арыстакаратаў ваявала на баку іспанцаў. У 1656 г. пасля смерці Жоана IV каралём быў абвешчаны яго цяжкахворы 13-гадовы сын Афонсу VI. Фактычна ўлада аказалася ў руках кралевы-рэгеншы Луізы дэ Гусман. У 1662 г. група апазіцыйна настроенай у дачыненні да каралевы арыстакратыі ажыццявіла дзяржаўны пераварот. Рэгенства было адменена. Пачалося самастойнае праўленне Афонсу VI.

Перашкодай для ўмацавання каралеўскай улады была і дзейнасць картэсаў. У 1641 г. яны прынялі рашэнне аб тым, што кароль не можа самастойна ўводзіць падаткі. Быў створаны пастаянна дзеючы орган картэсаў – Хунта трох сасловій.

У пачатку 1660-х гг. Іспанія паспрабавала вярнуць кантроль над Партугаліяй. Падтрымку Партугаліі аказала Англія. У 1662 г. дзве краіны падпісалі дагавор, у адпаведнасці з якім у Партугалію прыбылі некалькі тысяч англійскіх салдат і некалькі караблёў. У бітве пры Монціш-Клаpуш у 1665 г. іспанская армія была разбіта. У 1668 г. Іспанія нарэшце прызнала незалежнасць Партугаліі.

Рашаючыя перамогі над іспанцамі не прывялі да стабілізацыі сітуацыі ўнутры Партугаліі. У 1667 г. адбыўся новы дзяржаўны пераварот. Афонсу VI быў звергнуты, і апынуўся пад арыштам, хаця фармальна да сваёй смерці ў 1683 г. працягваў лічыцца каралём. Рэальная ўлада належала яго малодшаму

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

брату Педру II, які спачатку лічыўся рэгентам, а ў 1683 г. быў абвешчаны каралём.

Заканчэнне вызваленчай вайны садзейнічала стабілізацыі палітычнай сітуацыі ў Партугаліі. Завяршыўся час дварцовых пераваротоў. Каралеўская ўлада пачала паспяховае наступленне на правы картэсаў. Умацаваўшаяся каралеўская ўлада пачала праводзіць палітыку меркантылізму, стала заахвочваць стварэнне жалезаробчых, сцякольных, тэкстыльных мануфактур. Для таго, каб абараніць нацыянальныя мануфактуры ад замежнай канкурэнцыі, былі ўведзены высокія мытныя пошліны на многія замежныя тавары. Гэта садзейнічала развіццю прамысловасці і паскарэнню мадэрнізацыйных працэсаў у Партугалі. Аднак, паколькі вялікім палітычным уплывам карысталася арыстакратыя, палітыка меркантылізму ў Партугаліі была непаслядоўнай і непрацяглай. Да пачатку 1690-х гг. яна была згорнута. Важным наступствам аднаўлення незлежнасці стаў рост патрыятычных настрояў, нацыянальнай свядомасці сярод партугальцаў.

Заваяваўшы незалежнасць, Партугалія не змагла адстаяць цэласнасць сваёй каланіяльнай імперыі. Яна страціла Бамбей, в. Цэйлон, п-ў Малакка, уладанні па берагах Персідскага заліва. Тым самым завяршыўся першы этап Партугальскай каланіяльнай імперыі. Пачаўся другі, у якім ролю галоўнай калоніі Партугаліі выконвала Бразілія.

3. Пасля смерці Рышэльe ў 1642 г. і Людовіка XIII у 1643 г. Францыя сутыкнулася з глыбокім палітычным крызісам. Людовіку XIV на момант уступлення на трон было толькі 5 гадоў. Рэгентшай была прызначана каралева-маці Ганна. Але яе паўнамоцтвы былі абмежаваны Рэгенцкім саветам, які быў створаны па ўказу Людовіка XIII. Аднак ужо праз некалькі дзён пасля смерці краля Парламент Парыжа па просьбе каралевы адмяніў каралеўскі ўказ адносна Рэгенцкага савета, і кралева-рэгентша атрымала ўсю паўнату ўлады. Першым міністрам яна прызначыла кардзінала Мазарыні. Вынікам азначаных падзей было тое, што Парламент Парыжа вярнуў сабе высокую ступень уплыву на палітычнае жыццё, чаго яго пазбавіў Рышэльe. У Парыж вяртаюцца арыстакраты, якія былі высланы кардыналам Рышэльe, многія з іх пераходзяць у апазіцыю да кардынала Мазарыні.

З 1635 г. Францыя прымала непасрэдны ўдзел у Трыццацігадовай вайне. Вынікам стаў імклівы рост падаткаў. Талья, асноўны прамы падатак павялічыўся з 1635 па 1643 г. у 8 разоў. Магчымасці далейшага павелічэння падаткаў былі вычарпаны. У такой сітуацыі ўрад пачаў прыбягаць да займаў, якія рабіліся на самых выгадных для фінансістаў умовах. Кантакты з фінансістамі дазвалялі манархіі адчуваць сябе больш незалежна ў адносінах з Парыжскім Парламентам, які павінен быў рэгістраваць фінансавыя акты. Фінансавы крызіс падштурхнуў урад, каб пасягнуць на падатковы прывілеі, якімі карысталіся парыжанне. Спробы ўвесці ў сталіцы новыя падаткі выклікалі канфлікт урада з Парламентам Парыжа.

Трыццацігадовая вайна садзейнічала ўмацаванню абсалютызму. Урад імкнуўся стварыць новую мясцовую адміністрацыю, якая забяспечыла б

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

правядзенне распараджэнняў цэнтральнай улады і паступленне падаткаў. Такія традыцыйныя інстытуты як правінцыйныя губернатыры, фінансавыя бюро, мясцовыя суды цесна зрасліся з мясцовай элітай. Яны былі больш схільныя адстойваць яе інтарэсы, чым праводзіць у жыццё палітыку цэнтральных улад. Таму ў час вайны ўзмацняецца роля інтэндантаў. Яны не толькі сачылі за спагнаннем падаткаў у правінцыях, але сталі іх і размяркоўваць. Яны адцяснілі фінансавыя бюро, якія традыцыйна займаліся гэтымі пытаннямі. Інтэнданты ўзялі на сябе судовыя функцыі. Рэгулярна накіроўвалі ў Парыж інфармацыю аб стане спраў.

У пачатку 1648 г. закончылася дзеянне палеты для чыноўнікаў судовых палат. Для Парламента Парыжа ўмовы палеты засталіся ранейшымі, а для іншых чыноўнікоў (Падліковая палата, Палата ўскосных збораў, Вялікі савет) плата была павялічана. Парламент Парыжа, нягледзячы на выгадныя для сябе ўмовы, выступіў салідарна з іншымі судовымі палатамі. Ён прапанаваў усім судовым палатам прысылаць сваіх прадстаўнікоў на сумеснае пасяджэнне, каб абмеркаваць склаўшуюся сітуацыю. Гэты зварот можна разглядаць як пачатак Фронды.

Фронда – масавы сацыяльна-палітычны рух, які ахапіў Францыю ў 1648–1653 гадах. Сярод гісторыкаў вядзецца дыскусія адносна таго, чым была Фронда: феадальнай рэакцыяй, ці буржуазнай рэвалюцыяй? Версія, згодна якой, Фронда была буржуазнай рэвалюцыяй, прадстаўляецца малаабгрунтаванай. Буржуазія была яшчэ вельмі слабою, таму абсалютызм быў ёй патрэбен. Паміж буржуазіяй і каралеўскім урадам былі супярэчнасці. Напрыклад, буржуазія была незадаволена высокімі падаткамі. Але ўзнікаўшыя праблемы звязваліся з дзейнасцю таго ці іншага міністра, а не манарха.

На першым этапе Фронду ўзначальвае Парыжскі Парламент. Аднак ён не быў органам французскай буржуазіі, а органам дваранства мантыі. Большасць членаў Парламента лічылі сябе абаронцамі закона і вернымі слугамі караля. Парламент адстойваў шлях паступовага ўмацавання французскага абсалютызму ў рамках традыцыйнай прававой базы. Інтэнданты і фінансісты разглядаліся як прыхільнікі дэспатызму. Парыжскі Парламент змагаўся ў першую чаргу супраць іх, ён адыгрываў кіруючую роль у антыўрадавых выступленнях на першым этапе Фронды. Ён атрымаў назву парламенцкая Фронда (1648–1649 гады). Галоўнае патрабаванне ўдзельнікаў Фронды на гэтым этапе – прызнаць за Парламентам права кантраляваць увядзенне падаткаў і новых пасад.

Другі этап Фронды (1650–1653 гады) атрымаў назву Фронда прынцаў. Кіраўніцтва антыўрадавым рухам перайшло да вышэйшай арыстакратыі. Рэальнай палітычнай праграмы ў прынцаў не было, яны імкнуліся рэалізаваць свае эгаістычныя інтарэсы, хацелі каб кароль правіў, абапіраючыся на арыстакратыю. Галоўнаю памехаю для гэтага, на іх думку, быў кардынал Мазарыні. Да Фронды прымыкнулі правінцыйныя дваране, якія выступілі з ідэяй склікання Генеральных штатаў. Прынцы не падтрымалі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

іх. Яны абапіраліся на сваіх прыбліжаных, і выкарыстоўвалі рух сацыяльных нізоў. Напрыклад, у Бардо ў 1652 г. усталявалася плебейская дыктатура.

Думаецца, што найбольш дакладна Фронду можна ахарактарызаваць як шырокі антыабсалютысцкі рух, накіраваны супраць цэнтралізатарскай палітыкі рэгентшы Ганны Аўстрыйскай і першага міністра кардынала Мазарыні. Гэта была спроба арыстакратыі і старых карпарацый (Парламента Парыжа) адстаяць сваю ролю ў кіраванні дзяржавай ва ўмовах фарміравання абсалютызму. Гарадскія камуны адстойвалі свае традыцыйныя вольнасці, судзейскае саслоўе выступіла супраць абмежавання яго паўнамоцтваў, асабліва ў фінансавай сферы, вышэйшая арыстакратыя была незадаволена адхіленнем яе ад улады. Усе гэтыя слаі выступілі і супраць узмацнення новай, падначаленай непасрэдна і толькі ўраду бюракратыі. Г. Кёнігсберг абгрунтавана трактуе Фронду як выступленне старых урадавых карпарацый супраць новых.

Адрозненне Фронды ад іншых выступленняў арыстакратыі заключалася ў тым, што рух набыў масавы народны характар. Значная частка насельніцтва падтрымала арыстакратычную апазіцыю, спадзяючыся дабіцца аслаблення падатковага ціску. Таму Фронду можна разглядаць і як масавы антыпадатковы рух. Гэта яе другі бок.

Пасля агульнага пасяджэння судовых палат у чэрвені 1648 г. Парламент Парыжа заяўляе пра неабходнасць правесці дзяржаўныя рэформы. На разгляд каралеве была прадастаўлена іх праграма (27 артыкулаў). Яна прадугледжвала абвяшчэнне недатыкальнасці маёмасці і асобы, вяртанне ўсіх інтэндантаў з правінцый, адмену сістэмы адкупоў падаткаў, скарачэнне талы, вызваленне з турмаў арыштаваных за неўплату падаткаў, стварэнне палаты правасуддзя для расследавання злоўжыванняў фінансістаў, забарону на ўвядзенне без згоды пpалямента новых пасад і падаткаў.

Урад пагадзіўся з большасцю патрабаванняў, за выключэннем забароны на арышты па распараджэнню караля. Пацвярджалася права Парламента рэгістраваць усе дзяржаўныя акты, якія ўводзяць новыя падаткі. Мазарыні паспрабаваў перайсці ў контрнаступленне і 26 жніўня арыштаваў лідараў парламенцкай апазіцыі. У адказ у Парыжы ўспыхнула паўстанне. Пад ціскам парыжан 22 кастрычніка каралева вымушана была падпісаць 27 артыкулаў поўнасцю. Мазарыні не змірыўся з гэтай саступкай і пачынае сцягваць войскі да Парыжа. Двор і першы міністр уцякаюць у студзені 1649 г. з Парыжа. У адказ Парламент абвясціў Мазарыні смуцьянаў, загадаў яму пакінуць краіну, наклаў арышт на яго маёмасць. На бок Парламента перайшла чстка арыстакратыі – прынц Канці, герцаг Лангвіль, герцаг Бафор. Яны ўзначалілі армію Фронды. Пачынаецца грамадзянская вайна. Армія караля на чале з прынцам Кандэ не магла ўзяць сталіцу, але блакіравала падвоз харчавання. 1 красавіка 1649 г. было падпісана пагадненне, па якім Парламент адмовіўся ад патрабавання адстаўкі Мазарыні. У склаўшыхся ўмовах Кандэ, Канці, Лангвіль атрымалі магчымасць дыктаваць сваю волю ўраду. У другой палове 1649 г. парламенцкая Фронда працягваецца ў правінцыях: Гіені, Правансе. Тут разгарнулася барацьба за ўладу паміж губернатарамі і парламентамі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Мазарыні ў жніўні ўдалося дабіцца замірэння і тут. Парламенцкая Фронда закончылася.

Фронда прынцаў пачынаецца пасля таго, як 18 студзеня 1650 г. былі арыштаваны прынцы Кандэ і Канці. Каралева і Мазарыні хацелі вызваліцца з-пад іх апекі. Прыхільнікі прынцаў герцаг Буйёнскі, маршал Цюрэнн паднялі мяцеж у правінцыі. Іспанія заключае саюз з кандзістамі. Супраць Мазарані выступіў і камандаўшы каралеўскім войскам Гастон Арлеанскі. 7 лютага 1651 г. Мазарыні зноў уцякае з Парыжа. Кароль з каралевай вымушаны былі прыняць патрабаванне аб яго адстаўцы. А Кандэ і іншыя лідары Фронды вярнуліся ў Парыж. Але антымазарынаўскі блок быў нетрывалы. Узнік канфлікт паміж Парламентам і дваранствам. Сход дваранства ў Парыжы патрабуе склікання Генеральных штатаў, каб зменшыць уплыў Парламента.

5 верасня 1651 г. Людовік XIV быў абвешчаны паўналетнім і афіцыйна ўступіў у свае правы. Вакол яго аб'ядналіся прыхільнікі Мазарыні. Прынц Кандэ аднавіў вайну супраць урада, але многія яго ранейшыя прыхільнікі перайшлі на бок урада: Лангвіль, Цюрэнн, герцаг Буйёнскі. У снежні 1651 г. Мазарыні з арміяй, сабранай у Германіі, уварваўся на тэрыторыю Францыі. У адказ Парламент Парыжа абвясціў Мазарыні па-за законам. Распаражэннем парыжскіх улад была створана армія, на чале якой быў пастаўлены Гастон Арлеанскі. Ён уступіў у саюз з Кандэ. Вясной 1652 г. ваенныя дзеянні перамясціліся ў наваколле Парыжа. Жыхары сталіцы пакутавалі ад дрэннага забеспячэння горада прадуктамі і дарагавізны. У такой сітуацыі аўтарытэт Парламента хутка падаў, а гарадскія нізы праяўлялі ўсё больш сімпатый да прынцаў. 2 ліпеня ў бітве каля Сен-Антунскіх варот Цюрэнн разграміў войскі Кандэ. Ад поўнага знішэння іх выратавала тое, што парыжане ўпусцілі франдзёраў у сталіцу. 4 ліпеня кандзісты ажыццявілі пераварот у Парыжы. Мясцовы плебс і пераапранутыя салдаты ўварваліся ў ратушу і ўчынілі разню гарадскога патрыцыяту. Пасля гэтага быў сфарміраваны новы муніцыпалітэт, які выступаў на баку Кандэ.

Кароль, каб заваяваць папулярнасць у парыжан, 12 жніўня 1652 г. даў ганаровую адстаўку Мазарыні. А 23 верасня выдаў пракламацыю, у якой заклікаў парыжан аднавіць ранейшы муніцыпалітэт, што і было зроблена. Стомлены вайной Парыж схіляўся да міру з каралём. 13 кастрычніка Кандэ збег з Парыжа ў Фландрыю да іспанцаў. 21 кастрычніка 1652 г. кароль урачыста ўехаў у Парыж, а 3 лютага 1653 г. і Мазарыні вяртаецца ў Парыж. Парламент прызнаў сваё паражэнне. Прынц Кандэ канчаткова пераходзіць на бок Іспаніі. У жніўні 1653 г. каралеўская армія змагла падавіць паўстанне ў апошнім аплоце кандзістаў – Бардо. Гэта азначала заканчэнне Фронды.

Вынікам Фронды стала тое, што былі зломлены прэтэнзіі старых уладных карпарацый, перш за ўсё Парламента Парыжа, на актыўны ўдзел у ажыццяўленні палітычнай улады. Былі прысечаны спробы і вышэйшай арыстакратыі адыгрываць галоўную ролю ў кіраванні дзяржавай. Гэта адкрывала перспектывы для далейшага ўмацавання французскага абсалютызму. Ён у сваю чаргу зрабіў высновы з палітычнага крызісу сярэдзіны 17 ст., і ўмацаванне каралеўскай улады адбывалася плаўна, пры

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

захаванні пэўнай раўнавагі, суіснавання структур, якія былі звязаны з саслоўным прадстаўніцтвам, і новых структур, чыноўніцтва, якія былі характэрныя для абсалютнай манархіі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ